**Назва музея**: Музей "Гісторыя роднай вёскі"

**Назва ўстановы адукацыі**: Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Барздоўская сярэдняя школа Аршанскага раёна"

**Адрас музея**: Віцебская вобласць, Аршанскі раён, вул.Горацкая, д.116.

**Профіль музея**: комплексны (краязнаўчы).

**Сайт музея**: няма

**Старонка музея на сайце ўстановы адукацыі** :

https://borzd.goroo-orsha.by/патриотическое-воспитание/школьный-музей

**Старонка ў сацыяльных сетках:** няма

**Інфармацыя аб музеі:** Ідэя стварэння музея ўзнікла ў настаўнікаў і вучняў школы ў 1980 годзе, і на працягу васьмі год ішоў інтэнсіўны збор экспанатаў і матэрыялаў для экспазіцыі будучага музея. 22 красавіка 1988 года быў адкрыты музей "Гісторыя роднай вёскі" ў былой Барздоўскай сярэдняй школе Аршанскага раёна. У 1991 годдзе старую школу закрылі і музейныя прадметы знаходзіліся на адказным захаванні ў кіраўніка музея. У новым будынку школы вяліся работы па стварэнню экспазіцыі школьнага музея, які ўрачыста быў адкрыты 06.09.2016, кіраўнік музея – Пячонкін Валерый Георгіевіч. Музей змяшчае толькі сапраўдныя артэфакты і дакументы з дзяржаўных архіваў Беларусі, Расіі, Літвы якія сведчаць аб гісторыі вескі Барздоўка на працягу 300 апошніх гадоў. У экспазіцыі музея маюцца: старажытныя манеты і прадметы нашых продкаў 19 ст., фрагменты кафлі, дакументы 19 ст. аб в. Барздоўка, звесткі аб знакамітых земляках нашай вёскі, старажытныя іконы 19 ст. Асноўнымі накірункамі дзейнасці музея з'яўляецца папулярызацыя і прапаганда малой Радзімы, прадметаў хатняга ўжытку нашых продкаў і выхаваненне гонару за нашых дзядоў і прадзедаў. На базе музея працуе гурток "Юныя экскурсаводы". У музеі праводзяцца наступныя тэматычныя экскурсіі: "Хлеб усяму галава", "Гісторыя хлеба", "З гісторыі самавара", "Яны змагаліся за Радзіму", "Утварэнне калгасу", "Наша школа ў лічбах і фактах", "Імі ганарыцца школа".

**Кароткая характарыстыка музейных фондаў**: асноўны фонд – 180 прадметаў, які ўключае: дакументы, прадметы сялянскага быту, іконы, прылады працы, дапаможны фонд – 137, які ўключае: копіі дакументаў, фотаздымкі, школьныя падручнікі мінулых гадоў.

**Найбольш каштоўныя музейныя прадметы**: Скрабло – каменны век/2016 г.; манета вартасцю ¼ капейкі – 19 ст./2016 г.; Абраз Божай Маці – 19 ст./2016 г.; Абраз Ісуса Хрыста – 19 ст./2016 г., даваенны атэстат – 1937 г./2016 г.; вугальны прас з трубой – 19 ст./2016 г.

**Апісанне экспазіцый**:

1. "Каменны і жалезны век". Экспазіцыя змяшчае прадметы ўжытку і прымяненне ў быту старажытных прылад працы (скрабло, зернецёрка, наканечнікі каменных коп'яў).

2. “Барздоўка ў XVIII – пачатку XX стагоддзя”. У экспазіцыі прадстаўлены манеты і грашовыя знакі тых перыядаў, старажытныя абразы і малітоўныя кнігі, прадметы хатняга ўжытку.

3. “Утварэнне калгасу”. На фотаздымках і дакументах экспазіцыі прадстаўлена інфармацыя аб утварэнні калгасу ў в.Барздоўка, фотаздымкі першага старшыні і калгаснікаў, маюцца прадметы працы калгаснікаў таго часу.

4. “Яны змагаліся за Радзіму”. У экспазіцыі маюцца спіскі і фотаздымкі загінуўшых войнаў і землякоў, іх дакументы і ўзнагароды.

5. “Нашы знакамітыя землякі”. У экспазіцыі ідзе расповед аб людзях, якія маюць дзяржаўныя ўзнагароды за доблесную працу ў народнай гаспадарцы нашай краіны, муляжы ўзнагарод.

6. “Летапіс школы”. У экспазіцыі праследжваецца гісторыя школы з 1888 года па сучасны час, маюцца школьныя прылады, падручнікі розных год, фотаздымкі выпуснікоў першага выпуску школы, успаміны былых вучняў дарэвалюцыйнай, даваеннай і сучаснай школы.

7. “Этнаграфія”. У экспазіцыі прадстаўлены прадметы і прылады працы нашых продкаў XIX–XX ст., саматканае аддзенне, ручнікі, абрусы і другія вырабы.

8. “Куток беларускай хаткі”. Экспазіцыя прадстаўляе сабой куток сялянскай хаты пачатку XX ст., дзе размешчана печ, бабін кут, драўляная дзіцячая калыска.

**Узнагароды**:

Рэспубліканскі конкурс “Экспанат для музея”, рэспубліканская акцыі ”Я гэты край Радзімаю заву“, намінацыя “Таямніца ў рэчах”, 2021 г. – Дыплом III ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (вучань 8 кл. Макееў Уладзіслаў).

**Фотаздымкі музея:**
https://cloud.mail.ru/public/5WZc/Nic5Hvzu3

**Дадатковыя матэрыялы:**

Ролік: Вершаваная экскурсія па музею (https://www.youtube.com/watch?v=3-viOZZDphI)